Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд над Сяргеем Каваленкам перанесены на 29 сакавіка (абноўлена)

26.03.2013 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Актывіста КХП БНФ затрымалі ўвечары 25 сакавіка. Ноч ён правёў у ізалятары часовага ўтрымання. Паводле актывіста, на яго склалі два пратаколы пра адміністрацыйнае парушэнне – спачатку за пераход вуліцы ў неналежным месцы, потым – за нецэнзурную лаянку. 26 сакавіка ў 14.40 яго адпусцілі з-пад варты ў будынку Першамайскага райсуду, выпісаўшы позву на наступнае судовае пасяджэнне 29 сакавіка.

У суд Першамайскі райсуд Віцебску Каваленку прывозілі двойчы: спачатку з ІЧУ , але працэс над ім не пачаўся. Пад міліцэйскім канвоем яго павезлі ў пастарунак, сказаўшы, што трэба аформіць нейкія паперы.

Тым часам у будынак Першамайскага райсуду пачалі прыбываць міліцыянты ў форме і ў цывільным: як выкарысталі для таго, каб запоўніць судовую залю і не пусціць туды паплечнікаў актывіста. Але вольныя месцы ўсё адно засталіся, і некалькі слухачоў у залю ўсё ж трапілі .

Разгляд адміністрацыйнай справы па сутнасці так і не пачаўся. Суддзя Н.Карабліна была вымушана задаволіць хадайніцтва Каваленкі наконт абаронцы. Той заявіў, што хоча запрасіць абаронцу з Мінску. Суддзя адвяла на гэта менш за дзве гадзіны, але Сяргею Каваленку і ягонай жонцы ўдалося стэлефанавацца і дамовіцца са знаёмым мінскім адвакатам. Паколькі той будзе вольны толькі ў пятніцу, на гэты дзень і перанеслі працэс.

На суд па хадайніцтве Сяргея Каваленкі будзе запрошаны і перакладчык. 29 скавіка ў 9.00 суд будзе працягнуты.


Паводле Сяргея Каваленкі, гісторыя ягонага затрымання наступная: да абеда 25 сакавіка ён быў на судзе ў віцебскіх актывістаў. Потым у яго была сяброўская сустрэча з аднапартыйцамі, па вяртанні з якой яго сустрэлі міліцыянты – за пераход вуліцы ў неналежным месцы. За гэта наклалі штраф

памерам 450 тысяч рублёў. Потым павезлі на медыцынскае асведчанне на наяўнасць алкаголю ў крыві, але праходзіць яго Сяргей Каваленка адмовіўся. Урэшце на яго склалі пратакол за нецэнзурную лаянку і хуліганскія паводзіны ды змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання.




Твитнуть










"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY